**МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

пр-т Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл./факс +375 17 203 92 31, +375 17 203 34 35
e-mail: info@mininform.gov.by

**МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пр-т Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел./факс +375 17 203 92 31, +375 17 203 34 35
e-mail: info@mininform.gov.by

28.09.2021 № 01-14/691-сайт/кал

Накіроўваецца па электронай пошце

e-mail:

(для інфармавання іншых заяўнікаў)

Аб разглядзе звароту

У Міністэрстве інфармацыі ў межах кампетэнцыі разгледжаны Ваш калектыўны электронны зварот, які датычыцца публікацыі ў газеце «Мінская праўда» ад 07.09.2021.

У прымяненні да выкладзеных у звароце пытанняў паведамляем, што Міністэрства інфармацыі прымае меры рэагавання ў дачыненні як рэдакцый беларускіх сродкаў масавай інфармацыі, так і інтэрнэт-рэсурсаў выключна ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З «Аб сродках масавай інфармацыі» (далей – Закон аб СМІ). Пералік падстаў, па якіх Мініфармам можа быць прынята адпаведнае рашэнне, замацаваны, у тым ліку, у артыкулах $30^1$, 49 і $51^1$ Закона аб СМІ і з'яўляецца вычарпальным. Адна з такіх падстаў – давядзенне да ўсеагульнага ведама інфармацыі, распаўсюджванне якой забаронена. У сваю чаргу пералік забароненай інфармацыі змяшчаецца ў артыкуле 38 Закона аб СМІ, сярод якой інфармацыя, накіраваная на прапаганду вайны, экстрэмісцкай дзейнасці або змяшчае заклікі да такой дзейнасці, іншая інфармацыя, распаўсюджванне якой забаронена Законам аб СМІ, іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Адпаведнае рашэнне суда, якое ўступіла ва ўстаноўленым парадку ў законную сілу і пацвярджае наяўнасць у названых Вамі матэрыялах забароненай інфармацыі, у Міністэрстве інфармацыі адсутнічае.

Прымаць якія-небудзь меры ўздзеяння ў дачыненні да асобных работнікаў (журналістаў) рэдакцый СМІ ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам (як у сферы масавай інфармацыі, так і працоўнага) Міністэрства інфармацыі не мае права, у тым ліку, у сувязі з тым, што такія супрацоўнікі не знаходзяцца ў працоўных адносінах з Мініфармам.

Інфарміруем, што заснавальнікам унітарнага прадпрыемства «Інфармацыйнае агенцтва «Мінская праўда» з'яўляецца Мінскі абласны выканаўчы камітэт.

Іншыя пытанні, якія ёсць у звароце, у тым ліку аб правядзенні праверачных мерапрыемстваў у дачыненні да фізічных асоб на наяўнасць у іх дзеяннях складу крымінальнага злачынства, у кампетэнцыю Міністэрства інфармацыі таксама не ўваходзяць. Правам на ажыццяўленне такіх дзеянняў у сувязі з патрабаваннямі Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь надзелены органы крымінальнага праследавання.

Разам з тым у Міністэрстве інфармацыі сумесна з зацікаўленымі, уключаючы Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, прааналізаваны апублікаваны 07.09.2021 у газеце «Мінская праўда» матэрыял.

Паводле агульнага меркавання, публікацыя не спрыяе падтрыманню міжканфесійнага міру і згоды ў нашай краіне.

Атаясамліванне дзейнасці асобных каталіцкіх святароў з усёй Рымска-каталіцкай царквой у Беларусі з'яўляецца непрымальным.

Такія публікацыі могуць нанесці шкоду міжканфесійным адносінам у Рэспубліцы Беларусь, а таксама выклікаць негатыўныя наступствы ў грамадскіх адносінах.

Беручы пад увагу вышэйзгаданае, Міністэрства інфармацыі пісьмова запатрабавала ад рэдакцыі газеты «Мінская праўда» прыняць меры па недапушчэнні такіх публікацый у далейшым.

У сваю чаргу кіраўніцтва УП «Інфармацыйнае агенцтва «Мінская праўда» запэўніла Мінінфарм у тым, што ўсе выкладзеныя заўвагі і рэкамендацыі будуць выкананы.

Акрамя таго, Мінскім аблвыканкамам як заснавальнікам выдання сумесна з кіраўніцтвам інфармацыйнага агенцтва «Мінская праўда» праведзена рабочая нарада, на якой выпрацаваны меры па недапушчэнні такіх сітуацый.

Гэты адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, вызначаным артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб».

Намеснік Міністра І.І.Бузоўскі

03 зварот калектыўны